## Міхась БОЛСУН

*г. Гомель*



### У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ

*Памяці Героя Савецкага Саюза Мікіты Круглікава*

Баі ўзрывалі цішу росных ранкаў,
Ясноту дзён і крохкі сон начэй.
...Ён гнаў вайну ад Кіева на танку
І думаў пра Залессе* і Чачэрск,
Дзе да вайны жыццё бруіла ў хатах,
У святы песня матчына плыла,
Ды наляцелі крумкачамі каты,
Спалілі яго вёсачку датла.
І вестка апаліла болем сэрца,
Віруе прага помсты без мяжы.
У пекла бою экіпаж ірвецца,
Варожыя руйнуе рубяжы.
Святошына** начное ўзята з ходу,
І асядланы на Жытомір шлях.
У тых баях Героем стаў узводны,
Яго крывёй прапітана зямля.

* *Залессе – вёска, радзіма Героя.*
** *Святошына – пасёлак у Кіеўскай вобласці*

Не вырваўся з драпежных кіпцяў смерці,
Сумуе час: «Няма яго, няма...»
Ды між жывых, нібыта на паверцы,
Гучыць Героя светлае імя.

## САЛДАТКА

Бляск сярпа на плячы.
Песня з поля вядзе.
Горыч слёз уначы.
Промнік кволых надзей:
Вунь вярнуўся сусед,
Можа, прыйдзе і мой...
Колькі зведала бед,
Ёй вядома адной.
Двое ў хаце дзяцей —
Дзве крывінкі яе.
Ёсць спагада людзей,
Бацькі ж ім не стае.
Кліча ў поле зноў лён...
Дзе ж ты, голуб-Сцяпан?
Можа мучыць палон,
Ці памёр дзе ад ран?
Скрухі шэрае лёд.
Радасць ціхая сноў.
...Цвіў блакітам той лён,
Быццам вочы сыноў.

## КАШУЛЯ

*Уладзіміру Цырху*

Радасць несла вучня-маладетку.
Скрутак грэў і сэрца і руку.
У ёй — кашуля цёплая, у клетку,
Што ўручылі ў школе хлапчуку.

Бегла хутка пад сляды дарога.
Вучань школу думкамі хваліў.
Дома ж шчыра выгукнуў з парога:
— Добра як, што тата інвалід!
Словы тыя ўсіх кальнулі джалам.
Сумна дождж заплакаў у акне,
І кашуля хлопчыка ляжала
Як праклён мінулае вайне.





## ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ

Ажываюць архіваў радкі
І малюнкі з народнае памяці.
...Астывала плынь Сожа-ракі
Ад шалёнай свінцовае замеці.

Едкі дым па-над Гомелем плыў.
Скразнякі рэха бою адносілі,
І салдат пераможна курыў
У абдымках разбуджанай восені.

Сцяг лунаў, што Васільеў* узняў,
І лавілі яго людзей позіркі.
Радасць светлая шчаснага дня
У душы расцякалася возерам.

У вачах ззяў агеньчык надзей
На людское суладдзе адвечнае.
...Не забыты і сёння той дзень,
Гомель зноўку святочна расквечаны.

## ОРДЭНЫ

Іпоў салдат у бой, пад кулі.
Метал варожы хлопца сек...
...Укралі ордэны ў дзядулі,
Заплакаў згорблены сусед.

Смыліць на сэрцы крыўды рана,
А бэйбус юны, не ў гадах,
Гандлюе славай ветэрана,
Карціць яе за грошы прадаць.

Такі ў агонь пад кулі пойдзе,
Як злыдні ў край наш паляцяць?...
А мой сусед жа здзейсніў подзвіг,
Каб мы цанілі смак жыцця.

---

* *Міхаіл Васільеў — яфрэйтар, які першым узняў Чырвоны сцяг у вызваленым Гомелі на будынку электрастанцыі.*

* * *

Я – пякельнай вайны
 дзіця.
Я – зярнятка
 славянскай нівы.
Смак усякі
 адчуў жыцця,
Знаў бядотны час
 і шчаслівы.
Зла чужога
 калючы дрот
Мне калоў
 у маленстве пяткі.
Грэлі песняй
 жаўрук і дрозд.
У жыццё лянцеў
 без агляДкі.
Раскаціўся
 сувой дарог,
Ды з галоўнай
 душой не збочыў,
Што вядзе
 на родны парог
Днём спякотным
 і золкай ноччу.
Свецяць сціпла
 вёскі агні.
Вёсны – у квецені,
 зімы-белянць.
Цёпла там
 каля дабрыні,
Землякі яе
 ў сэрцах сцелянць.
За плячыма –
 цяжар гадоў.
З плугам, кнігаю
 дружаць рукі.
Мудрасць вёскі, яе дзядоў
Перадаць бы
 ў спадчыну ўнукам.